1. Бакланова, Т.И. Педагогика художественной самодеятельности : учеб. пособие / Т.И.Бакланова. – М.: МГИК, 1992. – 160 с.
2. Буткевич, М. К игровому театру /М.Буткевич. – М.: ГИТИС, 2002. – 288 с.
3. Горчаков, Н.М. Работа руководителя театрального коллектива с исполнителями / Н.М.Горчаков. – М.: Искусство, 1963. – 85 с.
4. Киселев, Н.В. Основы системы Станиславского : учеб. пособие / Н.В.Киселев, В.А.Фролов. – Ростов н/Д : Феникс, 2000 – 128 с.

# ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД У ВЫКЛАДАННІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

***Гулак А.А.*** *дацэнт кафедры*
*рэжысуры абрадаў і свят,*
*кандыдат філалагічных навук,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыка-арыентаваны падыход у выкладанні традыцыйнай народнай культуры – гэта найважнейшы аспект вучэбнага працэсу, які дазваляе рыхтаваць рэжысёраў свят, запатрабаваных у сучаснай культурнай практыцы. Вывучэнне народных абрадаў і свят каляндарнага і сямейнага цыклу, традыцыйнай і сучаснай святочнай культуры Беларусі, узаемадзеяння традыцый і навацый мае практычную неабходнасць, з’яўляецца актуальным і сацыяльна значным.

Вучэбная дысцыпліна “Святочная культура Беларусі” ахоплівае вялікае праблемнае поле: гэта фарміраванне светапогляду носьбітаў традыцыйнай культуры, сістэма народных вераванняў, ведаў пра сусвет, матэрыяльная культура ва ўсёй яе разнастайнасці, абрадава-святочная культура і неад’емная ад яе культура штодзённасці. Важнае значэнне надаецца спецыфічна этнічным характарыстыкам і рэгіянальным асаблівасцям. Усё гэта ўвасабляецца ў акрэсленні шляхоў стварэння сучасных свят на аснове і з улікам пераемнасці культурна-гістарычных традыцый.

Да прафесійных кампетэнцый, якія фарміруюцца ў студэнтаў ў выніку практыка-арыентаванага падыходу ў адукацыі,належаць здольнасці “арганізоўваць работу творчых калектываў падчас правядзення свят для дасягнення пастаўленых мэт і задач; выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры; праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і іншых установах; кансультаваць кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых, спартыўных, ваенных і іншых калектываў падчас падрыхтоўкі творчых праектаў; распрацоўваць і

ўвасабляць праекты розных святочных форм;выкарыстоўваць новыя накірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях; ладзіць арганізацыю і правядзенне масштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства” [1, с. 9].

Асноўныя накірункі, у якіх найбольш інтэнсіўна рэалізуецца практыка-арыентаваны падыход у вучэбным працэсе, гэта выкарыстанне ў лекцыях і практычных занятках актуальнай навуковай інфармацыі, а таксама прафесійных і аматарскіх дакументальных фільмаў, экспедыцыйных матэрыялаўі іншага аўдыёвізуальнага кантэнту. Знаёмства з даследаваннямі сучасных айчынных даследчыкаў Т. Валодзінай, У. Лобача, В. Лабачэўскай, А. Боганевай, І. Смірновай,Т. Кухаронак, М. Козенкі, Т. Варфаламеевай даюць магчымасць прадэманстраваць студэнтам особныя сегменты традыцыйнай святочнай культуры, зафіксаваныя ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі навукі. Вялікі інфарматыўны патэнцыял для рэалізацыі практыка-арыентаванага падыходу ў выкладанні традыцыйнай народнай культуры мае Нацыянальны Інвентар НКС Беларусі створаны (база даных і Інтэрнэт-рэсурс “Жывая спадчына Беларусі”). “Выхад на прадметнае поле сумежных этнаграфічных і фалькларыстычных дысцыплін, – піша Т. Валодзіна, – дазваляе больш шырока асэнсаваць антрапалагічныя асновы мастацкай дзейнасці чалавека <…>і адзінства феномена традыцыйнай культуры” [2, с. 85].

Важным у рэалізацыі практыка-арыентаванага падыходу з’яўляецца стратэгія падрыхтоўкі курсавых і, асабліва, дыпломных работ. Студэнты кафедры зарыентаваны на веданне культурнага патэнцыялу рэгіёна рэалізацыі іх рэжысёрскага праекта (гісторыка-культурная спадчына, памятныя месцы і славутыя людзі раёна, творчыя калектывы і інш.) У выніку абагульнення практычнага вопыту на кафедры сталі традыцыйнымі такія тэмы дыпломаў, як “Фальклорна-этнаграфічнае свята ў сельскім доме культуры: рэжысёрскі вопыт”, “Спецыфіка правядзення дзяржаўнага свята ва ўмовах раённага цэнтра”, “Рэжысёрская практыка прафесійнага свята ў абласным цэнтры” і інш.

Разам з тым, стаіць задача пазбегчы аднабаковасці і звужэння праблематыкі дыпломных даследаванняў. Сучасная навука і культурная практыка даюць шырокае поле для эксперымента і магчымасць не абыходзіць дыскусійныя ці маладаследаваныя тэмы. У якасці прыкладу можна назваць тэмы па народна-рэлігійнай святочнай культуры, якая замоўчвалася ў савецкі час ці інтэрпрэтавалася тэндэнцыйна. Гэта фэсты (храмавыя святы), абрадавыя практыкі ўшанавання культавых аб’ектаў, многія з якіх сёння ўжо ўнесены ў Нацыянальны Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Напрыклад, Будслаўскі фэст (аг. Будслаў Мядзелскага р-на Мінскай вобл.), абрад “Варварынская свяча”(в. Басценавічы Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.), абрад “Бразгун” і яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складовы элемент: шанаванне іконы святых Пятра і Паўла (в. Наркі Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл.) і іншае. Такія тэмы паспяхова распрацоўваюцца ў дыпломных праектах кафедры, даючы арыгінальныя і змястоўныя вынікі.

Надзвычай важным дасягненнем апошняга часу ў плане практыка-арыентаванага падыходу стала адкрыццё філіяла кафедры на базе ўстановы "Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту".Асноўныя задачы супрацоўніцтва сфакусіраваны на практыка-арыентаваным падыходзе: правядзенне мерапрыемстваў, якія спрыяюць лепшай адаптацыі студэнтаў у працэсе навучання да канкрэтных вытворчых умоў, атрыманню імі навыкаў працы ў працоўных калектывах; забеспячэнне вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практык, выканання курсавых, дыпломных работ па напрамках асноўнай дзейнасці ўстановы "Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту".

Але асноўным фактарам, які дазваляе гаварыць аб тым, што на кафедры рэжысуры абрадаў і свят у вучэбным працэсе рэалізуецца практыка-арыентаваны падыход, з'яўляецца вялікі практычны вопыт выкладчыкаў, якім прафесіяналы дзеляцца з тымі, хто заступіць ім на змену.


1. Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі : вышэйшая адукацыя першая ступень :Спецыяльнасць 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках) КваліфікацыяРэжысёр. Выкладчык. – Мінск : Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2013. – 30 с.

2. Володина, Т.В. Успехи и болевые точки белорусской фольклористики последних лет / Т.В. Володина // Навстречу Третьему Всероссийскому конгрессу фольклористов. Сборник научных статей. – М. : Гос. республ. центр русского фольклора, 2013. – С. 79–98.


# ПРАКТИКО-ОРИЕНТИРОВАННЫЙ ПОДХОД В ПРЕПОДАВАНИИ ДИСЦИПЛИНЫ «ДЖАЗОВОЕ СОЛЬФЕДЖИО» ДЛЯ СТУДЕНТОВ ЭСТРАДНОГО ПРОФИЛЯ


***Дожина Н.И.,*** *заведующий кафедрой теории музыки и музыкального образования, кандидат искусствоведения, доцент*


Джазовое сольфеджио, как практическая учебная дисциплина, призванная воспитать и обучить через современное эстрадно-джазовое искусство, является относительно новой в учебном плане УВО культуры и искусств Беларуси. В БГУКИ джазовое сольфеджио было введено только несколько лет назад в качестве предмета по



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ